# РАДЗІМЕ, НЕЗАЛЕЖНАЙ, ЛЮБАЙ, МІРНАЙ…

**Ваўкавыскі раён. У вялізным шэрагу мерапрыемстваў, прымеркаваных да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дня Рэспублікі) і 80-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, не засталося па-за ўвагай яшчэ адно. 3-га ліпеня ў аграгарадку Вярэйкі (Ваўкавыскі раён, Гродзенская вобласць) выступіў член СПБ, паэт Віктар Курловіч.**

Як паведамілі нам арганізатары тэматычнай культурнай імпрэзы, 3-га ліпеня на пляцоўцы Вярэйкаўскага Дома культуры адбылася канцэртная праграма пад красамоўнай назвай «Квітней, мая Беларусь!». Мерапрыемства было прысвечана Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Галоўная ідэя – патрыятызм: патрыятычнае выхаванне, патрыятычнае стаўленне да жыцця. У канцэртнай праграме прыняў удзел паэт-зямляк, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Віктар Георгіевіч Курловіч, які прачытаў свае вершы прысвечаныя Радзіме. Разам с музычнымі нумарамі ў выкананні мясцовых самабытных артыстаў і творчых калектываў паэтычная старонка ад Віктара Курловіча нікога не пакінула абыякавым і прымусіла сэрцы аднавяскоўцаў біцца хутчэй. Адрасаванае вобразу Радзімы паэтычнае Слова прагучала кранальнай споведдзю, прызнаннем у любові такой шматпакутнай, але адзінай і дарагой роднай зямельцы ад яе вернага сына.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На здымках:** у канцэртнай праграме «Квітней, мая Беларусь!» выступіў член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Віктар Курловіч. Аграгарадок Вярэйкі, Ваўкавыскі раён, Гродзенская вобласць. 3-га ліпеня 2024 года.


«Верэйкаўскі Дом культуры»
«Верейковский Дом культуры»


ФІЛІЯЛ
«Вярэйкаўскі Дом культуры»
ФИЛИАЛ
«Верейковский Дом культуры»


19